Хоцімская бібліятэчная сетка
Трасцінская сельская бібліятэка

Серыя: Партрэт ветэрана



# Ён абараняў Ленінград. В.П.Сафонаў




Трасціно, 2013 г.


Хоцімская бібліятэчная сетка
Трасцінская сельская бібліятэка

# Ён абараняў Ленінград. В.П.Сафонаў

**Блакада Ленінграда – адзін з самых жудасных эпізодаў Вялікай Айчыннай вайны. І разам з тым - адзін з самых яркіх подзвігаў савецкага народа ў барацьбе з фашысцкімі агрэсарамі.**

Адным з тых, хто абараняў горад, быў наш зямляк - жыхар вёскі Трасціно **Васіль Пятровіч Сафонаў**.

Нарадзіўся ў 1927 годзе.

У 1940 годзе закончыў шэсць класаў Васілёўскай сямігодкі. У 14 год ён прыехаў у г.Ленінград і паступіў у адно з рамесных вучылішчаў на спецыяльнасць лакіроўшчык. Затым сам вызваўся працаваць у Кранштаце. З 21 ліпеня 1941 года па 10 лістапада 1947 года працаваў на Кранштацкім заводзе ордэна Леніна Чырвоназнамённага Балтыйскага флота на пасадзе маляра цэха №3. Гэты завод уваходзіў у склад дзеючай Арміі з 22 чэрвеня 1941 года па 31 ліпеня 1944 года і прымаў удзел у абароне Ленінграда з верасня 1941-га па 27 студзеня 1944-га.

Перажыў і лютыя зімы, і голад, чым унёс сваё ўкладанне ў агульны подзвіг.

За час службы быў узнагароджаны медалямі



**“За абарону Ленінграда”**



**“За перамогу над Германіяй”**